Падтрымай "Вясну" на PATREON

Актывістаў, затрыманых каля рэстарана "Паедзем паядзім" аштрафавалі больш чым на 2 000 далараў дапоўнена

04.11.2019 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед, сілавыя структуры



Дзяніс Урбановіч. Фота: Зміцер Казакевіч

У другой палове дня 4 лістапада Мінскі раённы суд разглядзеў адміністрацыйныя справы маладафронтаўцаў **Дзяніса і Максіма Урбановічаў**, **Віталя Трыгубава,** а таксама **Валерыя Рабцава**, затрыманых і збітых учора ў Курапатах, каля рэстарана "Паедзем паядзім".

Яшчэ аднаго затрыманага напярэдадні, кандыдата ў дэпутаты ад Беларускай хрысціянскай дэмакратыі **Зміцера Казакевіча,** вызвалілі ў той жа вечар, аднак пратаколы правапарушэнняў склалі ўсё адно: па арт. 17.1 КаАП (дробнае хуліганства) і арт. 23.4 (непадпарадкаванне).

Зміцер Казакевіч у размове з прэсавай службай БХД распавёў падрабязнасці жорсткага затрымання яго і іншых актывістаў падчас Курапацкай варты 3 лістапада.

Паводле яго, актывісты, як і звычайны, стаялі на варце, збіраліся раздаваць улёткі. У гэты час Зміцер Казакевіч паспрабаваў прайсці на тэрыторыю рэстарацыі "Паедзім паядзім", каб раздаваць улёткі і размаўляць з выбарнікамі. Актывістаў на тэрыторыю не пускалі, але калі брама адчынілася і яны змаглі ўвайсці, ахоўнікі пачалі іх выпіхваць. Аднаму з хлопцаў пры гэтым зламалі вуду са сцягам.

Затым з'явіліся два ўчастковыя міліцыянты, а за імі – шэры мікрааўтобус без апазнавальных знакаў.

> *"Выбеглі адтуль людзі без формы. Кінулі нас усіх у гэты бусік. І ўсё дарогу ад гэтага рэстарана і да Бараўлянскага РАУС білі нагамі, скакалі па нас. На мяне зверху кінулі яшчэ Віталю (Трыгубава – рэд.), і нас дваіх нагамі мясілі. Дзяніса Урбановіча, Іларыёна Трусава – усіх адхадзілі. Мы калі прыехалі, я думаў, што Максім Урбановіч зусім без прытомнасці"*, - расказаў Зміцер Казакевіч.

Паводле кандыдата, у РАУС яго 1,5 гадзіны не пускалі ў прыбіральню. І адвялі толькі пасля пагрозы не даваць паказанні.

У РАУС на актывістаў склалі адміністрацыйныя пратаколы паводле артыкулаў 17.1 (дробнае хуліганства) і 23.4 (непадпарадкаванне міліцыі) КаАП.

> *"Я ім кажу, што працаўнік міліцыі мусіў мне патлумачыць, што супраць мяне будзе ўжыты артыкул 23.4 – гэтага нічога не было. Адразу без нічога кінулі ў бусік"*, - сказаў Зміцер Казакевіч, які адмовіўся прызнаваць віну.

Выпусцілі яго толькі дзякуючы наяўнасці пасведчання кандыдата ў дэпутаты.

> *"Дзяніса Урбановіча вельмі моцна збілі. Яго ў больніцу абласную вазілі – вельмі сур'ёзныя праблемы. Іларыёна Трусава забралі бацькі, бо няпоўнагадовы. А на астатніх, наколькі я ведаю, склалі пратаколы і пакінулі іх у РАУС"*, - расказаў актывіст.

Пра далейшыя дзеянні міліцыянтаў у дачыненні да яго, у тым ліку і суду, Змітру Казакевічу сказалі чакаць паведамлення. Сам ён наведаў больніцу і зафіксаваў пабоі.

Як паведамляе Павел Севярынец на сваёй старонцы ў фэйсбуку, Дзяніса Урбановіча аштрафавалі агулам на 65 базавых велічынь (1657 рублёў 50 капеек) – 25 базавых за "дробнае хуліганства" і 40 базавых за "непадпарадкаванне законнаму патрабаванню службовай асобы".

> *"У шпіталі наклалі на шыю шыну і "адпусьцілі дахаты". Ля дзьвераў яго чакалі бараўлянскія. Са шпіталя забралі на міліцэйскай машыне, паклалі на падлогу на расьцяжцы. Трымалі ў райаддзеле да трох начы",* – падкрэслівае палітык.

Як піша Радыё Свабода, паводле суду, менавіта Дзяніс Урбановіч учыніў бойку на ўваходзе ў рэстарацыю, крычаў і парушаў грамадзкі парадак. Супраць яго сведчылі дырэктарка рэстарацыі **Святлана Дубкова**, ахоўнікі **Мікалай Красоткін** і **Віктар Юневіч** (абодва былыя міліцыянты).

Урбановіч не прызнаў віну. Паводле яго, бойку каля ўваходу ў рэстарацыю справакавалі ахоўнікі ўстановы. Урбановіч прасіў дапытаць у судзе супрацоўнікаў АМАП, якія фігуруюць у пратаколе на яго.

Дзеянні гэтых міліцыянтаў актывіст назваў «злачыннымі» і патлумачыў, што яны збівалі яго, «круцілі шыю» ў аўтамабілі, калі везлі з Курапатаў у пастарунак. Паводле Урбановіча, яны былі не ў адмысловай форме. Суддзя **Аляксей Кропачаў** гэтае хадайніцтва не задаволіў.

У Дзяніса Урбановіча траўмаваны пазванок шыі, на шыі ў яго накладзены бінт, ён з цяжкасцю паварочвае галаву. Актывіст сказаў, што ў міліцыі адмовіліся прымаць у яго заяву на дзеянні АМАПу пры яго затрыманні.

Пасля Дзяніса Урбановіча суддзя Кропачаў разглядзеў справу брата актывіста, **Максіма Урбановіча**. Яму прызначаны штраф у 510 рублёў (20 базавых). Супраць актывіста сведчылі тыя ж сведкі, якіх апыталі на працэсе супраць ягонага брата: ахоўнікі і дырэктарка рэстарацыі, а таксама ўчастковы міліцыянт **Аляксей Аўчыннікаў**.

Таксама 4 лістапада плануюць судзіць актывістаў Віталя Трыгубава і Валерыя Рабцава (на суд супраць апошняга выкліканыя ўсё тыя ж сведкі). Адміністрацыйны працэс супраць кандыдата ў дэпутаты Змітра Казакевіча, як ён сам думае, адбудзецца пазней у Маскоўскім раённым судзе.

Суддзя **Вадзім Казей** аштрафаваў Валерыя Рабцава на 40 базавых велічынь (1020 рублёў) па артыкулах КаАП 17.1 і 23.4, Віталя Трыгубава - таксама на 40 базавых велічынь па тых жа артыкулах.

Твитнуть







СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ

Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

Чатырох жыхароў Паставаў асудзілі да "хатняй хіміі" за фотаздымак з Маршу (дапоўнена)

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 20 палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO



ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

"Усё зроблена, каб паралізаваць тваю волю", — былая палітзняволеная Вольга Класкоўская

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

"Мораць голадам і холадам". Новыя сведчанні пра катаванні і акалічнасці смерці Вітольда Ашурка ў ПК-17

ГАЛОЎНАЕ

"Я, напэўна, проста памру тут": хто з палітвязняў знаходзіцца ў асаблівай рызыцы за кратамі





АПОШНІЯ НАВІНЫ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

Валерыя Цапкалу завочна асудзілі да 17 гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму (дапоўнена)

Запрашаем на прэзентацыю дакладу “Абмежаванне свабоды выказвання меркаванняў пад выглядам барацьбы з экстрэмізмам і тэрарызмам” у Вільні

Палітзняволенай Вікторыі Кульшы ў трэці раз дадалі тэрмін па крымінальнай справе

Мужчыну асудзілі на два гады калоніі па двух дыфамацыйных артыкулах

Паўтара года калоніі прысудзілі экс-кандыдату ў прэзідэнты Андрэю Дзмітрыеву

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

Дырэктару газеты "Белорусы и рынок" Канстанціну Залатых прысудзілі чатыры гады калоніі

Да пяці гадоў калоніі. Асудзілі палітвязняў, якія вывесілі нацыянальныя сцягі Беларусі і Украіны

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

VOICE OF BELARUS

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

